Культура

штотыднёвая грамадска-палітычная газета | выдаецца з кастрычніка 1991 года | № 1 (1700) | 3 студзеня 2025 г.

# З НОВЫМ ГОДАМ!



Падчас навагодняга балю ў Палацы Незалежнасці. Фота БелТА.

Працяг тэмы на стар. 2



# Натхняльнае свята

Паланэз, полька, шапелуаз.
Рэспубліканскі навагодні баль для моладзі адбыўся ў Мінску. Гэта адна з самых прыгожых традыцый суверэннай Беларусі. У мерапрыемстве паўдзельнічаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.

Свята разгарнулася 24 снежня ў зале ўрачыстых цырымоній Палаца Незалежнасці, куды запрасілі найлепшых прадстаўнікоў адоранай і таленавітай моладзі з усіх рэгіёнаў краіны — амаль 330 чалавек. З прывітальным словам да іх звярнуўся Кіраўнік дзяржавы.

— Сёння ў наш Палац Незалежнасці прыйшло яркае, прыгожае свята. Натхняльнае свята. Свята, галоўным аздабленнем якога з’яўляецеся вы, нашы дарагія ўдзельнікі навагодняга балю, — сказаў лідар. — Для мяне вельмі важна, каб вы адчулі гэтае свята, асаблівую атмасферу Палаца — сімвала нашай незалежнасці. Паглядзелі з яго вокнаў на Мінск, убачылі, што родная Беларусь — краіна магчымасцей.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: важна і тое, каб юнакі і дзяўчаты, знаходзячыся тут сярод людзей розных узростаў, статусаў, пасад, адчулі сутнасць укладу нашага грамадства. У ім усе роўныя ў магчымасцях, а змена пакаленняў грунтуецца на пашане да гістарычных дасягненняў народа і — абавязкова — на пераемнасці.

З гэтай ідэяй Прэзідэнт і прыйшоў калісьці ў вялікую палітыку — захаваць пераемнасць.

— Такая праўда жыцця і філасофія поспеху: хочаш падняцца яшчэ вышэй — не ламі пабудаваную да цябе пакаленнямі апору. Абапірайся на яе і ідзі наперад, — заявіў лідар.

Кіраўнік дзяржавы таксама адзначыў, што баль дорыць маладым людзям шмат шанцаў знайсці сяброў, паразмаўляць з тымі, чый жыццёвы вопыт можа стаць сур’ёзным арыенцірам.

Прэзідэнт павіншаваў усіх з Новым годам, пажадаў быць шчаслівымі і заклікаў берагчы нашу Беларусь.

Танцавальная праграма распачалася з традыцыйнага паланэза ад дэбютантаў. Затым закружыў вальс. Да яго, як заўжды, далучыўся і Аляксандр Лукашэнка. Сёлетняй навінкай стаў шапелуаз. У астатнім баль, як звычайна, уключаў кракавяк, польку, галоп, падэпатынер, паўночную кадрылю і бурэ. Класічную частку завяршыў флэшмоб пад кампазіцыю “Потолок ледяной...” у выкананні Прэзідэнцкага аркестра Беларусі, які суправаджаў усю музычную праграму.

Адвольная частка прадугледжвала больш свабодны фармат. Калі залу пакінулі высокія госці, хлопцы і дзяўчаты паўдзельнічалі ў майстар-класе па ча-ча-ча, у танцавальнай бітве з прафесіяналамі і ў флэшмобе: рок-н-рол, танга, румба, стэп. А пасля моладзь весялілася пад сучасныя кампазіцыі ў выкананні пераможцаў і лаўрэатаў розных конкурсаў і фестываляў. Пакідаючы Палац Незалежнасці, кожны, напоўнены яркімі ўражаннямі і незабыўнымі эмоцыямі, нёс з сабой навагоднія падарункі ад Кіраўніка дзяржавы.

Падрабязнасці — на сайце president.gov.by



## Шаноўныя чытачы!

Калектыў рэдакцыйна-выдавецкай установы “Культура і мастацтва” шчыра віншуе вас з Новым годам і Раством!

Жадаем здароўя, міру і дабрабыту. Няхай у 2025 годзе спраўдзяцца ўсе планы і надзеі, натхненне не пакідае вас, а стваральная праца на карысць нашай роднай Беларусі будзе плённай.

Нясіце культуру, жывіце мастацтвам!

## Выхадныя і будні — 2025

**Калі адпачынак, а калі работа?**
**Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 14 лістапада 2024 года № 839 зацверджаны пераносы працоўных дзён у 2025-м.**

### Студзень

| ПН | АЎ | СР | ЧЦ | ПТ | СБ | НДЗ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |

Так, 6 студзеня (панядзелак) перанеслі на суботу 11-га. Дні адпачынку — чатыры: 4 (субота), 5 (нядзеля), 6 (панядзелак) і 7 (аўторак) студзеня.

### Красавік

| ПН | АЎ | СР | ЧЦ | ПТ | СБ | НДЗ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 |
| 28 | 29 | 30 | | | | |

28 красавіка (панядзелак) перанеслі на суботу 26-га. Дні адпачынку — тры: 27 (нядзеля), 28 (панядзелак) і 29 (аўторак) красавіка.

* Арганізацыі з улікам спецыфікі вытворчасці (работы) маюць права пераносіць названыя працоўныя дні на іншыя суботы.

### Ліпень

| ПН | АЎ | СР | ЧЦ | ПТ | СБ | НДЗ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 |

4 ліпеня (пятніца) перанеслі на суботу 12-га. Дні адпачынку — чатыры: 3 (чацвер), 4 (пятніца), 5 (субота) і 6 (нядзеля) ліпеня.

### Снежань

| ПН | АЎ | СР | ЧЦ | ПТ | СБ | НДЗ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 |
| 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 |
| 29 | 30 | 31 | | | | |

26 снежня (пятніца) перанеслі на суботу 20-га. Дні адпачынку — чатыры: 25 (чацвер), 26 (пятніца), 27 (субота) і 28 (нядзеля) снежня.

Падрабязней — на сайце pravo.by

### Непрацоўныя дні ў 2025-м:

**1 і 2 студзеня** — Новы год,
**7 студзеня** — Раство Хрыстова (праваслаўнае Раство),
**8 сакавіка** — Дзень жанчын,
**29 красавіка** — Радаўніца (па календары праваслаўнай канфесіі),
**1 мая** — Свята працы,
**9 мая** — Дзень Перамогі,
**3 ліпеня** — Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі),
**7 лістапада** — Дзень Кастрычніцкай рэвалюцыі,
**25 снежня** — Божае Нараджэнне (каталіцкае Раство).



Графік асабістага прыёму грамадзян у Міністэрстве культуры:



# За дзень наступны ўсяе зямлі

**Навекі слава тым, хто ў полі ратным**
**загінулі за родныя палі,**
**за наш народ, за лёс народаў братніх,**
**за дзень наступны усяе Зямлі...**

Радком з верша Пімена Панчанкі мы распачынаем каляндар-2025: сёлета беларусы разам з іншымі народамі былога СССР адзначаць 80-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

— Гэта найважнейшая памятная дата для нашых людзей, звязаных агульнай гісторыяй, блізкіх духоўна і культурна, — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на пасяджэнні Вышэйшага Дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы 6 снежня ў Мінску. — Гэтак жа, як і нашы продкі 80 гадоў таму, 9 мая мы разам на Краснай плошчы памянём ахвяр той страшнай вайны і адзначым важную гадавіну гістарычнай перамогі савецкага народа над фашызмам.

Незлічоныя подзвігі. Мільёны страчаных жыццяў. Вялікая Айчынная вайна пакінула глыбокі шрам у сэрцы нашага народа і стала вядучай тэмай у мастацтве на доўгія часы.

Сёння мы прадстаўляем праект “За дзень наступны ўсяе зямлі”, які РВУ “Культура і мастацтва” зладзіла сумесна з Беларускім дзяржаўным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і Беларускай дзяржаўнай акадэміяй мастацтваў.

У календары змешчаны фрагменты палотнаў з музейнага фонду. З дапамогай QR-кода можна не толькі ўбачыць твор цалкам, але і пачуць яго, перанесціся ў час, калі здабывалі Перамогу.

Старт праекту быў дадзены летась: матэрыялы да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў друкаваліся ў часопісе “Мастацтва”. Сёння карціны ажываюць на старонках газеты “Культура”. У планах — зладзіць перасоўную выставу. Праект паспрыяе захаванню гістарычнай памяці, развіццю патэнцыялу маладых творцаў на найлепшых прыкладах беларускай мастацкай школы, умацаванню павагі да гераічнага мінулага дзеля будучыні.



### Студзень

| ПН | АЎ | СР | ЧЦ | ПТ | СБ | НДЗ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |
| 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | | |

▪ Міхаіл Савіцкі. Камсамольцы. 1970.

**Савіцкі Міхаіл Андрэевіч** (18.02.1922 — 08.11.2010). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Скончыў Мінскае мастацкае вучылішча (1951), Маскоўскі мастацкі інстытут імя В. Сурыкава (1957). Член Беларускага саюза мастакоў з 1958. Народны мастак БССР (1972). Народны мастак СССР (1978). Лаўрэат Дзяржаўных прэмій Беларусі і СССР. Герой Беларусі (2006). Працаваў у станковым жывапісе ў жанрах тэматычнай карціны і партрэта, а таксама ў манументальна-дэкаратыўным мастацтве (роспіс, габелен). Творы знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, фондах БСМ і інш.

Адскануйце QR-код і навядзіце камеру на карціну.

Над ажыўленнем карціны шчыравала студэнтка спецыяльнасці “Дызайн віртуальнага асяроддзя” БДАМ Настасся Зянько пад кіраўніцтвам Крысціны Стрыкелевай, прафесара кафедры тэорыі і практыкі камунікатыўнага дызайну, кандыдата мастацтвазнаўства, дацэнта.



## Люты

| ПН | АЎ | СР | ЧЦ | ПТ | СБ | НДЗ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | 1 | 2 |
| 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 |
| 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 |
| 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | | |

▪ Аляксандр Дзямарын. Пераправа. Год 1944. 1985.

**Дзямарын Аляксандр Міхайлавіч** (15.03.1938 — 13.07.2018). Скончыў Горкаўскае мастацкае вучылішча (1959), Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1966). Член Беларускага саюза мастакоў з 1969. Працаваў у кніжнай і станковай графіцы, а таксама ў жывапісе. Творы знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, фондах Беларускага саюза мастакоў, Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў, Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Адсканyйце QR-код і навядзіце камеру на карціну.

Над ажыўленнем карціны шчыравала студэнтка спецыяльнасці “Дызайн віртуальнага асяроддзя” БДАМ Настасся Зянько пад кіраўніцтвам Крысціны Стрыкелевай, прафесара кафедры тэорыі і практыкі камунікатыўнага дызайну, кандыдата мастацтвазнаўства, дацэнта.



## Сакавік

| ПН | АЎ | СР | ЧЦ | ПТ | СБ | НДЗ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | 1 | 2 |
| 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 |
| 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 |
| 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 |
| 31 | | | | | | |

Адсканyйце QR-код і навядзіце камеру на карціну.

Ажыла карціна з дапамогай магістранта кафедры тэорыі і практыкі камунікатыўнага дызайну БДАМ Аляксея Голаса пад кіраўніцтвам Крысціны Стрыкелевай, прафесара кафедры тэорыі і практыкі камунікатыўнага дызайну, кандыдата мастацтвазнаўства, дацэнта.

▪ Віктар Грамыка. Партызанскія тропы. 1964.

**Грамыка Віктар Аляксандравіч** (02.01.1923 — 10.07.2019). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Скончыў Мінскае мастацкае вучылішча (1951), Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1959). Член Беларускага саюза мастакоў з 1959. Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР (1970). Народны мастак Беларусі (1991). Працаваў у станковым жывапісе ў жанрах карціны, пейзажа, партрэта. Творы знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, НЦСМ, Магілёўскім абласным мастацкім музеі імя П. Масленікава і інш.



## Красавік

| ПН | АЎ | СР | ЧЦ | ПТ | СБ | НДЗ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 |
| 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 |
| 28 | 29 | 30 | | | | |

▪ Сяргей Раманаў.
Перад рэйдам па тылах ворага.
1980.

**Раманаў Сяргей Рыгоравіч** (17.09.1914 — 11.01.2001). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Скончыў Маскоўскае мастацкае вучылішча памяці 1905 г. (1940). Член Беларускага саюза мастакоў з 1945. Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР (1966). Працаваў у розных тэхніках станковай і кніжнай графікі, а таксама жывапісе. Творы знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, фондах БСМ, Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў, Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Адсканўйце QR-код і навядзіце камеру на карціну.

Ажывілі карціну студэнткі БДАМ Алеся Саковіч і Наталля Бычок, якія навучаюцца па спецыяльнасці "Дызайн віртуальнага асяроддзя", пад кіраўніцтвам Крысціны Стрыкелевай, прафесара кафедры тэорыі і практыкі камунікатыўнага дызайну, кандыдата мастацтвазнаўства, дацэнта.





## Май

| ПН | АЎ | СР | ЧЦ | ПТ | СБ | НДЗ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 |
| 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 |
| 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | |

Адсканўйце QR-код і навядзіце камеру на карціну.

Надаць карціне рух дапамагла студэнтка БДАМ спецыяльнасці "Дызайн віртуальнага асяроддзя" Паліна Кабакова пад кіраўніцтвам Крысціны Стрыкелевай, прафесара кафедры тэорыі і практыкі камунікатыўнага дызайну, кандыдата мастацтвазнаўства, дацэнта.

▪ Іван Ціханаў.
Сустрэча партызан
з Чырвонай Арміяй. 1964.

**Ціханаў Іван Ціханавіч** (22.02.1922 — 11.05.1993). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1959). Член Беларускага саюза мастакоў з 1964. Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР (1983). Працаваў ва ўсіх жанрах станковага жывапісу, а таксама ў манументальна-дэкаратыўным мастацтве. Творы знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, фондах БСМ, НЦСМ, Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.






▪ Яўген Зайцаў.
Парад партызан у Мінску. 1947.

**Зайцаў Яўген Аляксеевіч** (21.12.1907 (03.01.1908) — 13.09.1992). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Скончыў Віцебскі мастацкі тэхнікум (1930), Ленінградскі інстытут жывапісу, скульптуры і архітэктуры (1937). Член Беларускага саюза мастакоў з 1940. Народны мастак БССР (1963). Член-карэспандэнт Акадэміі мастацтваў СССР (1973). Працаваў у станковым жывапісе ва ўсіх жанрах. Творы знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, фондах БСМ, Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Адсканулйце QR-код і навядзіце камеру на карціну.

Ажыла карціна з дапамогай студэнткі спецыяльнасці “Дызайн віртуальнага асяроддзя” БДАМ Лізаветы Аўсяннікавай пад кіраўніцтвам Паўла Ганчарова, выкладчыка кафедры тэорыі і практыкі камунікатыўнага дызайну, магістра мастацтвазнаўства.








Адсканулйце QR-код і навядзіце камеру на карціну.

З дапамогай студэнткі спецыяльнасці “Дызайн віртуальнага асяроддзя” БДАМ Юліі Ганько пад кіраўніцтвам Паўла Ганчарова, выкладчыка кафедры тэорыі і практыкі камунікатыўнага дызайну, магістра мастацтвазнаўства, карціна ажыла.

▪ Анатоль Шыбнёў. Год 1944.
Вызваленне. 1977–1979.

**Шыбнёў Анатоль Дзям’янавіч** (11(24).12.1907 — 19.03.1990). Скончыў Адэскі мастацкі інстытут (1934), Ленінградскі інстытут жывапісу, скульптуры і архітэктуры (1940). Член Беларускага саюза мастакоў з 1945. Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР (1963). Працаваў ва ўсіх жанрах станковага жывапісу. Творы знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, фондах Беларускага саюза мастакоў, Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў, Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.



## Жнівень

| ПН | АЎ | СР | ЧЦ | ПТ | СБ | НДЗ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | 2 | 3 |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 |

▪ Анатоль Шыбнёў.
Вызваленне Мінска. 1949.

**Шыбнёў Анатоль Дзям'янавіч** (11(24).12.1907 — 19.03.1990). Скончыў Адэскі мастацкі інстытут (1934), Ленінградскі інстытут жывапісу, скульптуры і архітэктуры (1940). Член Беларускага саюза мастакоў з 1945. Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР (1963). Працаваў ва ўсіх жанрах станковага жывапісу. Творы знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, фондах Беларускага саюза мастакоў, Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў, Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Адсканульце QR-код і навядзіце камеру на карціну.

З дапамогай студэнткі спецыяльнасці "Дызайн віртуальнага асяроддзя" БДАМ Дар'і Герасімені пад кіраўніцтвам Паўла Ганчарова, выкладчыка кафедры тэорыі і практыкі камунікатыўнага дызайну, магістра мастацтвазнаўства, карціна ажыла.





Адсканульце QR-код і навядзіце камеру на карціну.

Рухомай карціна стала дзякуючы студэнтцы спецыяльнасці "Дызайн віртуальнага асяроддзя" БДАМ Ксеніі Мальцавай пад кіраўніцтвам Паўла Ганчарова, выкладчыка кафедры тэорыі і практыкі камунікатыўнага дызайну, магістра мастацтвазнаўства.

▪ Павел Гаўрыленка.
Партызанскі аэрадром. 1950.

**Гаўрыленка Павел Нічыпаравіч** (15(28).02.1902 — 04.02.1961). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Скончыў Віцебскі мастацкі тэхнікум (1930). Член Беларускага саюза мастакоў з 1940. Працаваў у станковым жывапісе ў жанрах карціны і пейзажа, а таксама ў графіцы. Творы знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

## Верасень

| ПН | АЎ | СР | ЧЦ | ПТ | СБ | НДЗ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 |
| 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 |
| 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 |
| 29 | 30 | | | | | |



## Кастрычнік

| ПН | АЎ | СР | ЧЦ | ПТ | СБ | НДЗ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |
| 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | | |

▪ Ісак Давідовіч. Перамаглі.

**Давідовіч Ісак Аронавіч** (21.11(04.12).1911 — 05.12.1993). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Скончыў Віцебскі мастацкі тэхнікум (1930). Член Беларускага саюза мастакоў з 1932. Працаваў у станковым і манументальным жывапісе і графіцы. Творы знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, фондах Беларускага саюза мастакоў, Магілёўскім абласным мастацкім музеі імя Паўла Масленікава, Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Літаратурным музеі Янкі Купалы ў Мінску, Літаратурным музеі Льва Талстога ў Маскве.

Адскануйце QR-код і навядзіце камеру на карціну.

Ажыла карціна дзякуючы студэнтцы спецыяльнасці “Дызайн віртуальнага асяроддзя” БДАМ Марыі Талімончык пад кіраўніцтвам Паўла Ганчарова, выкладчыка кафедры тэорыі і практыкі камунікатыўнага дызайну, магістра мастацтвазнаўства.





Адскануйце QR-код і навядзіце камеру на карціну.

Ажывіў карціну студэнт спецыяльнасці “Дызайн віртуальнага асяроддзя” БДАМ Лі Сюань пад кіраўніцтвам Крысціны Стрыкелевай, прафесара кафедры тэорыі і практыкі камунікатыўнага дызайну, кандыдата мастацтвазнаўства, дацэнта.

▪ Уладзімір Міхайлоўскі. Перамога. 1988.

**Міхайлоўскі Уладзімір Карлавіч** (23.04.1931 — 04.09.1999). Скончыў Мінскае мастацкае вучылішча (1956), Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1961). Член Беларускага саюза мастакоў з 1970. Працаваў у станковым жывапісе. Творы знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, фондах Беларускага саюза мастакоў, Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў, Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

## Лістапад

| ПН | АЎ | СР | ЧЦ | ПТ | СБ | НДЗ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | 1 | 2 |
| 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 |
| 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 |
| 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 |






Ісак Давідовіч, Яўген Ціхановіч. Свята Перамогі 9 мая 1945 г. у Мінску. 1955.

**Ціхановіч Яўген Мікалаевіч** (25.11.1911 — 05.07.2005). Скончыў Віцебскі мастацкі тэхнікум (1932). Член Беларускага саюза мастакоў з 1933. Працаваў у станковым жывапісе, кніжнай і станковай графіцы, экслібрысе. Творы знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, фондах Беларускага саюза мастакоў, Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў, Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і інш.

Адсканулйце QR-код і навядзіце камеру на карціну.

Над ажыўленнем карціны шчыравала студэнтка спецыяльнасці "Дызайн віртуальнага асяроддзя" БДАМ Злата Шаўкун пад кіраўніцтвам Крысціны Стрыкелевай, прафесара кафедры тэорыі і практыкі камунікатыўнага дызайну, кандыдата мастацтвазнаўства, дацэнта.





# Старыя казкі маладзеюць

**Да зімовых вакацый тэатры падрыхтавалі не толькі святочныя, але і іншыя прэм'еры. Вядомыя сюжэты часам разгортваюцца па-новаму!**

У Магілёўскім абласным драмтэатры руская народная казка **"Іван-царэвіч і Шэры Воўк"** стала аўтарскай. Малады рэжысёр Каміля Хусаінава і вядучая артыстка Алена Крыванос, чаргуючы прозу з паэзіяй, стварылі не проста інсцэніроўку, а ўласную п'есу, поўную нечаканасцей і постмадэрнісцкіх спасылак. Спектакль для кожнага яго ўдзельніка — штосьці накшталт бенефісу, бо пераўвасабляюцца акцёры імгненна і неаднаразова. А яшчэ — спалучаюць сваю справу з прыёмамі лялькаваджэння. Над падмосткамі лётаюць і вялізная Жар-птушка, і Дракон, якім кіруюць аж сем артыстаў (мастак-пастаноўшчык — Ала Сарокіна).

Магілёўскі абласны тэатр лялек прэзентаваў "манахромны дэтэктыў" паводле А. Ліндгрэн — **"Карлсан"**. Нязвыклае жанравае азначэнне тлумачыцца не толькі інсцэніроўкай Данііла Жугжды, рэжысурай Валерыя Карышава, але і працай мастака-пастаноўшчыка Вольгі Шчарбінскай. Спектакль атрымаўся вельмі стыльным. Ён амаль цалкам вырашаны ў графічнай манеры: рэальнасць — чорна-белая, затое фантазіі Малыша пра Карлсана — каляровыя. Паваротная сцэна дазваляе хутка пераносіць дзеянне з адной лакацыі ў іншую. Не сумуе і дарослая публіка: хлопчыка, відаць, выхоўвае самотны бацька, а Фрэкен Бок аказваецца маладой ды прывабнай.

Спектакль **"Сяброўства шмат не бывае"** Новага драматычнага тэатра распавядае пра лясных звяроў. Найбольшую ўвагу прыцягвае каларытны Вожык (Аксана Баранок). Рэжысёры Лізавета Машковіч і Фёдар Пясецкі (пастаноўка будзе яго дыпломнай працай, творца задзейнічаны тут і ў ролі Ваўка) выціснулі з п'есы "Трэці лішні" расійскага драматурга Уладзіміра Ілюхова ўсё магчымае, прыдумалі штосьці сваё. У іх рэдакцыі гісторыя пра тое, што сябраваць можна і добрай кампаніяй таксама, папулярызуе савецкую класіку — найперш песні з мультфільмаў.

У Мінскім абласным тэатры лялек "Батлейка", што ў Маладзечне, выпусцілі **"Казкі дзядулі Батлея, ці Лялечныя цуды пад Новы год"**. Да колішняй пастаноўкі "Дзюймовачкі" дадаўся новы персанаж — Батлей. Герой і распавядае гісторыю незвычайнай дзяўчынкі. А надалей, як плануецца, можа з'явіцца цэлы шэраг казак ад дзядулі Батлея. Яго імя, дарэчы, папулярызуе маладзечанскі калектыў ды батлейку як феномен.

**"За Снежнай каралевай"** запрашае рушыць Беларускі дзяржаўны тэатр лялек і яго галоўны рэжысёр Яўген Карняг. Спектакль для публікі 6+ зразумелы і больш малодшым дзецям. Артысты прапануюць гледачам... прачытаць кнігу. І робяць гэта разам з Тролем у малой зале. Адмысловае выданне — панарамнае, у трох тамах (мастак — Вольга Дваравая). Аповед — атмасферны, дзівосны. У казцы ўзнікаюць новыя дэталі, знойдзеныя ў літаратурным арыгінале. Спектакль натхняе на ўдумлівае чытанне, што ўключае фантазію.

Беларускі дзяржаўны маладзёжны тэатр таксама звярнуўся да адной з самых вядомых у свеце чароўных гісторый. **"Спячую прыгажуню"** паставіла рэжысёр Таццяна Аксёнкіна. Малады драматург Ксенія Шталянкова напісала не інсцэніроўку, а ўласную п'есу, у якой ліквідавала характэрную для казак адсутнасць звыклай логікі. Наадварот, у спектаклі кожная дробязь, усе словы і дзеянні атрымліваюць тлумачэнне, звернутае да сённяшніх хлопчыкаў і дзяўчынак. Подых сучаснасці не ўплывае на строі ад Таццяны Мацэвіч, але змяняе матывацыю ўчынкаў. Прынц не цалуе дзяўчыну (маўляў, мы з ёй незнаёмыя), ды ўсё ж знаходзіць спосаб яе абудзіць. Героі паступаюць, як дзеці. Іх непасрэднасць, памножаная на агульную постмадэрнісцкую іронію, парушае залішне рамантычны пасыл, уласцівы фіналу. А прапанова завесці сабаку ўвогуле сведчыць: персанажы па сваёй псіхалогіі бліжэйшыя да цяперашніх школьнікаў, чым да казачных герояў. Каб нарэшце абудзіць юных гледачоў ды іх бацькоў, прачнуцца трэба не толькі прынцэсе, але і самім тэатрам.

Падобныя пераасэнсаванні — добрая з'ява. Яны выхоўваюць уважлівага гледача як у дзіцяці, так і ў дарослым.

**Надзея БУНЦЭВІЧ**
Фота Уладзіміра ШЛАПАКА і з архіва Магілёўскага абласнога тэатра лялек



1. "Сяброўства шмат не бывае"
2. "Спячая прыгажуня"
3, 4. "Карлсан"

# Афіша
## з 3 па 10 студзеня

### НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20,
тэл.: 8 017 3970163
(экскурсійнае бюро)

- **Пастаянныя экспазіцыі.**
- Выставачны праект **"Кудрэвічы. Адданыя мастацтву"**, прымеркаваны да 140-годдзя з дня нараджэння заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Уладзіміра Мікалаевіча Кудрэвіча (1884–1957). **Да 13 студзеня.**
- Выстава **"Страты і вяртанні. Лёс мастацкіх каштоўнасцей Дзяржаўнай карціннай галерэі. 1939–1957"**, прымеркаваная да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 85-годдзя Нацыянальнага мастацкага музея. **Да 20 студзеня.**
- Экскурсіі: **"Самыя-самыя..." (6+), "Якога колеру зіма?" (6+), "Казкі Усходу" (10+), "Міфы Старажытнай Грэцыі і Рыма" (10+), "Партрэты даўнія мінулых пакаленняў..." (10+), "Пяць моў кахання" (16+), "Жаночы партрэт" (16+), "Мінск у музеі" (16+). Праводзяцца заўсёды.**

УНП 100377771

### МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА 1-Й ПАЛОВЫ XIX СТ."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а,
тэл.: 8 017 3637796, 8 017 3588878

- **Пастаянная экспазіцыя.**
- Тэматычная праграма **"Раство ў Ваньковічаў"** з майстар-класам па вырабе навагодніх цацак і 3D-паштовак. **Да 15 студзеня.**
- Выстава жывапісу бытавога жанру XIX – пачатку XX стагоддзя **"Імгненні жыцця"** з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея. **Да 18 студзеня.**
- Праграма **"Кафляныя «люстэркі» шляхецкай сядзібы". Праводзіцца заўсёды.**
- Квэст **"Таямніцы старажытнай сядзібы"**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
- Квэст **"Пошукі мінулага". Праводзіцца заўсёды.**
- Экскурсія **"Інтэр'ер шляхецкай сядзібы"**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
- Экскурсія **"Шлях мастака Валенція Ваньковіча"**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
- Экскурсія **"Сядзібны партрэт"**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**

УНП 100377771

### МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА

Мінскі р-н, Астрашыцка-Гарадоцкі с/с, в. Аколіца, вул. Іванаўская, 17б,
тэл.: 8 017 5074468

- **Пастаянная экспазіцыя.**
- Выстава **"Хронікі Музея беларускага народнага мастацтва. 45 гадоў"**, прымеркаваная да 45-годдзя з дня адкрыцця філіяла для наведвальнікаў. **Да 2 сакавіка.**
- **Батлеечны спектакль. Праводзіцца заўсёды.**
- Майстар-клас **"Саломапляценне". Праводзіцца заўсёды.**
- Майстар-клас **"Лялька-матанка". Праводзіцца заўсёды.**
- Майстар-клас **"Ткацтва". Праводзіцца заўсёды.**

УНП 100377771

### МУЗЕЙ В. К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37,
тэл.: 8 0222 650203,
8 0222 658800

- **Пастаянныя экспазіцыі.**
- Art-lectorium **"Зразумелае мастацтва". Праводзіцца заўсёды.**

Падрабязней на сайце **artmuseum.by** альбо па тэлефонах 8 0222 650203, 8 0222 658800.

УНП 100377771



Вашы прапановы ды ідэі чакаем на e-mail: kim@kultura-info.by.



## МАГІЛЁЎСКІ АБЛАСНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР

г. Магілёў, вул. Першамайская, 7,
тэл.: 8 0222 656604 (каса),
сайт: **mdrama.by**

• Чароўная казка па матывах рускай народнай **"Іван-царэвіч і Шэры Воўк" (6+)**. Прэм'ера. **3 студзеня ў 11.00, 4 студзеня ў 11.00, 5 студзеня ў 11.00, 7 студзеня ў 11.00 і 14.00.**
• Вадэвіль у 2 дзеях **"Бяда ад пяшчотнага сэрца" (16+). 3 студзеня ў 18.30.**
• Prank comedy у 2 дзеях **"Шалёныя грошы" (16+). 4 студзеня ў 18.30.**
• Рамантычная камедыя ў 2 дзеях **"Я бяру гэтага хлопца" (16+). 5 студзеня ў 18.30.**
• **#PORTALТЭАТР з Галінай Лабанок (16+). 8 студзеня ў 18.30.**
• Камедыя ў 2 дзеях **"Тарцюф" (16+). 9 студзеня ў 18.30.**
• Кіч у 2 дзеях **"Пікова дама" (18+)**. Начны паказ і фотасэт у дэкарацыях. **10 студзеня ў 19.30.**

УНП 700184039



## НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7,
тэл.: 8 017 3654237, 8 017 3576627,
пошта: kupalabilet@mail.ru

• Спектакль для дзяцей **"Гісторыя шакаладнага дрэва" (0+)**. Чароўная казка пра двух юных эльфаў. Галоўная сцэна. **3 студзеня ў 11.30, 4 студзеня ў 11.30 і 17.00, 5 студзеня ў 11.30.**
• Камедыя ў 2 дзеях **"Паўлінка" (12+)**. Галоўная сцэна. **3 студзеня ў 19.00.**
• Спектакль **"Бясконцая гісторыя" (16+)**. Прэм'ера. Камерная сцэна. **4 студзеня ў 19.00.**
• Рэквіем у 1 дзеі **"Вечар" (12+)**. Галоўная сцэна. **5 студзеня ў 19.00.**
• Трагікамедыя **"Дзядзечкаў сон" (16+)**. Прэм'ера. Галоўная сцэна. **8 студзеня ў 19.00.**
• Містычная легенда пра каханне ў 1 дзеі **"Чорная панна Нясвіжа" (12+)**. Галоўная сцэна. **9 студзеня ў 19.00.**
• Імпрэза **"Музыка душы. Роднае" (0+)**. Камінная зала. **10 студзеня ў 19.00.**
• Трагікамедыя **"Апошні атракцыён" (16+)**. Галоўная сцэна. **11 студзеня ў 19.00.**

УНП 100377901



## ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г. п. Мір, Карэліцкі р-н,
Гродзенская вобл.,
тэл.: 8 01596 36290,
8 01596 36270

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• **Майстар-клас па размалёўванні навагодніх упрыгожванняў. 3 студзеня ў 12.00, 4 студзеня ў 12.00.**
• Дзіцячы калядны баль **"Зімовая казка"**. Партрэтная зала. **5 студзеня ў 12.00 і 15.00.**
• **Калядны баль для дарослых. 11 студзеня ў 19.00.**
• Часовая экспазіцыя **"Жыццё без меж"**, прысвечаная творчасці людзей з асаблівымі патрэбамі. **Да 19 студзеня.**
• Экспазіцыя **"Арсенал: ваенная зброя ў гістарычным кантэксце"**. Сумесны праект з Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеем. Паўночны корпус. **Да 22 кастрычніка.**
• **Лекцыя-візуалізацыя. Кожную сераду і суботу.**
• Экспазіцыя **"Войны XX стагоддзя. Гэта ў Мірскім замку"**.
• Аглядныя і тэматычныя экскурсіі.
• Экскурсіі з элементамі тэатралізацыі для дзяцей і дарослых.
• Экскурсія для дваіх **"Інтрыгі Купідона"**.
• Сямейная квэст-экскурсія **"Легенды і паданні Мірскага замка"**.
• Музейныя заняткі для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту: **"Святочная страва для князя па старадаўнім рэцэпце"**, **"Асаблівасці жаночага касцюма XVIII ст."**, **"Арганізацыя войска і вайсковая справа ВКЛ у XVI ст."**, **"Печы з каробкавай кафлі XVI–XVII стст. у палацы князёў Радзівілаў"**.

УНП 590201541



## НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19,
тэл.: 8 01770 20602, 8 01770 20660,
8 029 5518051, 8 029 1903149

### Палацавы ансамбль

• Культурнае мерапрыемства **"Новы год у палацы". 3—4 студзеня з 12.00 да 19.00.**
• Канцэрт **"Калядны джаз". 5 студзеня ў 15.00 і 17.00.**
• Дзіцячы спектакль **"Падарунак для зорачкі". 6 студзеня ў 13.00 і 15.00.**
• Часовая экспазіцыя **"Звяжам свет прыгажосцю"**. Калекцыйная зала "Нумізматыка і фалерыстыка". **Да 26 студзеня.**
• Экспазіцыя ёлачных цацак і ўпрыгожанняў **"Калі запальваюцца ёлкі"** з прыватнай калекцыі Наталлі Кавалёвай (Віцебск). Малая выставачная зала. **Да 9 лютага.**
• Экспазіцыйны праект **"Не пакідай мяне, мой светлы сум"** скульптараў Льва і Сяргея Гумілеўскіх. Вялікая выставачная зала. **Да 13 красавіка.**
• Міжнародны выставачны праект **"Castrum doloris. Пахавальны цырыманіял нясвіжскага двара". У складзе пастаяннай экспазіцыі.**
• Квэст **"Палацавыя таямніцы"**.
• Віртуальныя выставы: **"Ператвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны"**, **"Нясвіж — здабытак сусветнай культуры"**, **"Разбуральны след вайны ў архітэктуры Нясвіжа"**, **"Шэдэўры калекцыі і ўнікальныя артэфакты музея-запаведніка «Нясвіж»"**.
• Тэматычныя і агляднᴧя экскурсіі па гісторыка-архітэктурных помніках і ландшафтных парках Нясвіжа.

### Інфармацыйна-касавы цэнтр (г. Нясвіж, вул. Гейсіка, 1)

• Экспазіцыя твораў графікаў **"Мастак — кніга — тэкст". Да 15 студзеня.**

### Ратуша

• Часовая экспазіцыя **"Рэгенерацыя гістарычнай часткі г. Нясвіж. Эфектыўнае гарадское асяроддзе". Да 20 лютага.**

**Пастаянныя экспазіцыі**
• **"Гарадское самакіраванне ў Нясвіжы ў XVIII — 1-й палове XIX ст."**.
• Калекцыя гадзіннікаў XIX—XX стагоддзяў **"Культура часу"**. З фондаў музея-запаведніка.

**Мерапрыемствы**
• Квэсты: **"Безаблічны артэфакт"**, **"Карта сямі каралеўстваў"**, **"Музейны дэтэктыў"**, **"Музейнае расследаванне"**.
• Культурныя мерапрыемствы: **"Прыём у княгіні"**, **"Дзень нараджэння ў ратушы"** (група да 12 чалавек ад 6 да 11 гадоў).
• Сюжэтна-ролевая развівальная праграма **"Школа шпіёнаў"** (да 25 чалавек).
• Гульня-знаёмства **"Музейка аб музеі"** (група да 25 чалавек ад 4 да 7 гадоў).
• Гульнявая праграма **"Выкрунтасы"** (група да 25 чалавек).

Падрабязнасці па тэлефонах 8 01770 20602, 8 01770 20660 або на сайце **niasvizh.by**.

УНП 600207920



## НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай Камуны, 1,
тэл.: 8 017 2431041 (каса),
8 017 3615493

• Канцэрт **"Навагодні агеньчык" (12+)**. Камерная зала імя Л. П. Александроўскай. **3 студзеня ў 19.30, 5 студзеня ў 18.30, 8 студзеня ў 19.00.**
• Опера ў 2 дзеях **"Гісторыя Кая і Герды" ("Снежная каралева") (6+)**. Перад спектаклем — навагоднее прадстаўленне ў фае тэатра. **4 студзеня ў 11.00 і 18.00.**
• Балет у 2 дзеях **"Шчаўкунок" (6+). 5 студзеня ў 18.00, 8 студзеня ў 19.00.**
• Экскурсія **"Унікальны свет закулісся Вялікага тэатра Беларусі" (6+). 9 студзеня ў 15.30, 11 студзеня ў 14.00.**
• Опера ў 2 дзеях **"Чароўная флейта" (12+). 9 студзеня ў 19.00.**
• Балет у 2 дзеях **"Папялушка" (6+). 10 студзеня ў 19.00, 12 студзеня ў 18.00.**
• Опера-балет у 2 дзеях **"Вілісы. Фатум" (12+). 11 студзеня ў 18.00.**

УНП 191081322



## БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8,
тэл.: 8 017 2030792, 8 029 1440792

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Выстава ёлачных рэтрацацак **"Цацкі, якія захоўваюць памяць". Да 12 студзеня.**
• Часовая экспазіцыя **"Музей, якому служыш"**, прысвечаная 80-годдзю ўстановы.
• Часовая экспазіцыя **"Адзінай памяці верныя"**, прысвечаная 80-годдзю вызвалення Беларусі.

Падрабязнасці ў сацыяльных сетках і на сайце **warmuseum.by**.

УНП 100235472



## НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЦЭНТР СУЧАСНЫХ МАСТАЦТВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Някрасава, 3,
тэл.: 8 017 2350331,
час працы: серада — нядзеля
з 12.00 да 20.00

• Выставачны праект **"Трыяда. Скульптура — архітэктура — горад". Да 2 лютага.**
• Выстава Сяргея Даджа **"АБСТРАШКА і абстрактная АЗБУКА". Да 2 лютага.**
• Выстава твораў з фонду НЦСМ **"Цёплыя стасункі". Да 16 лютага.**
• Персанальная выстава Аляксандра Трускоўскага **"[Не]асабістае пытанне". Да 16 лютага.**

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 47,
тэл.: 8 017 2350332, 8 017 3990978,
час працы: аўторак — нядзеля
з 12.00 да 20.00

• Выстава **"Рэха мадэрнізму. Ад Манэ да Кандзінскага". Да 19 студзеня.**

УНП 192543414



## БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2,
тэл.: 8 0212 669077 (каса)

• Святочная праграма **"З Новым годам, добры Гном!"**, танцавальна-забаўляльная праграма **"Гнамуляндыя танцуе зноў" (3+)**. Глядзельная зала і фае тэатра. **3 студзеня ў 14.00 і 17.30, 4 студзеня ў 11.00 і 14.00, 5 студзеня ў 14.00, 11 студзеня ў 11.00, 12 студзеня ў 11.00.**
• Навагодняя танцавальна-забаўляльная праграма **"Казкі чароўнага лесу" (2+)** ад тэатра лялек "Ухтышка", Віцебск. Фае тэатра. **11 студзеня ў 17.00, 12 студзеня ў 17.00.**

УНП 300001869



t.me/kultinfa

Карыстаецеся стыкерамі ў анлайн-ліставанні і хочаце папоўніць сваю калекцыю? Прапануем стыкерпак ад "Культуры"! Выказаць эмоцыі вам дапамогуць класікі беларускай літаратуры. Выбірайце самую трапную цытату — і здзяйсняйце суразмоўцаў у Telegram!

*

**Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь**

аказвае фізічным і юрыдычным асобам паслугі па рэстаўрацыі і кансервацыі ікон, твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Тэлефоны: **8 017 3970163, 8 025 6677819**.

УНП 100377771




КУЛЬТУРА

Сайт: **kultura-info.by**
E-mail: **kim@kultura-info.by**

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА). Выдаецца на беларускай мове.

Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".

Дырэктар — КУЗНЯЦОВА Наталля Васільеўна.

Рэдакцыя газеты "Культура": Галоўны рэдактар — КУЗНЯЦОВА Наталля Васільеўна.
Намеснік галоўнага рэдактара — ШЧУРОК Жанна Генадзьеўна.
Адказны сакратар — Галіна МАЛІНОЎСКАЯ.
Рэдактар аддзела — Віктар ГАЎРЫШ.

Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх.

Тэлефон: 8 017 2860797.
Тэлефон-факс: 8 017 3345741.
Бухгалтэрыя: 8 017 3345735.
Рэкламны аддзел: 8 017 2860797.

Падпісныя індэксы: 63875, 638752, 63879.
Ільготныя на паўгоддзе: 63872, 638722 (зніжка 15 %).
Камплект (газета "Культура" і часопіс "Мастацтва"): 63874, 638742 (зніжка 10 %).

Аўтары дапісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванне аўтара можа не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.

Набыць газету ў Мінску можна ў крамах "Белдрук" на пр-це Незалежнасці, 48, і Пераможцаў, 5, на вул. Лабанка, 2, Валадарскага, 16, Няміга, 30, Леніна, 18, Максіма Багдановіча (ля прыпынку "Ст. м. «Няміга»"), у падземных пераходах на плошчы Перамогі і станцыі метро "Пятроўшчына".

Падпісана ў друк 30.12.2024 у 16.00. Замова № 51. Наклад 4202.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва «Беларускі Дом друку»". 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004.

© "Культура", 2025.

Рознічны кошт — па дамоўленасці.

* — матэрыял на правах рэкламы.